*УДК 631.1 (476) (091) «1986/1991»*

*М. У. СМЯХОВІЧ*

# «НОВАЯ АГРАРНАЯ ПАЛІТЫКА» Ў СССР І ЯЕ АСАБЛІВАСЦІ Ў БССР: АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ (1986–1991 гг.)

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 18.03.2014)*

Даследаванне гісторыі перабудовы – адна з актуальных праблем беларускай гістарыяграфіі. Айчыннымі гісторыкамі пакуль не назапашана навуковых прац у фармаце дысертацый ці манаграфій па гісторыі перабудовы, у тым ліку і па гісторыі развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці. Асобныя аспекты гісторыі перабудовы асвятляюцца ў главе 7 «Беларускае грамадства ў гады перабудовы» (аўтар У. Навіцкі), у 6-м томе шасцітомнай «Гісторыі Беларусі» [1, с. 543]. Аднак становішча сельскай гаспадаркі, спробы яе рэфармавання не знайшлі належнага адлюстравання на старонках гэтага выдання. Больш шырока аграрная праблематыка перабудовачнага часу разглядаецца ў параграфе 2.2 «Аграпрамысловы комплекс Беларусі ва ўмовах інтэнсіфікацыі вытворчасці ў 1986–1990 гг.» манаграфіі В. Саковіча «Сельское хозяйство Республики Беларусь в 1980–2007 гг.: тенденции развития», якая была выдадзена ў 2008 г. [2, с. 66]. У гэтым параграфе В. Саковіч, грунтуючыся на макраэканамічнай статыстыцы, паспрабаваў правесці аналіз агульнага становішча сельскагаспадарчай вытворчасці рэспублікі, адлюстраваць вынікі рэфармавання. Але матэрыялаў ці аналізу аграрнай палітыкі ў галіне сельскагаспадарчай вытворчасці на мікраэканамічным узроўні, узроўні канкрэтных рэгіёнаў, калгасаў і саўгасаў праца В. Саковіча не змяшчае.

Трэба адзначыць і наступнае. Выкананне заданняў Харчовай праграмы ў гады перабудовы не знаходзілася ў цэнтры ўвагі партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва СССР. На першым плане было імкненне да рэфармавання савецкай эканомікі, у тым ліку і сельскай гаспадаркі. Гісторыя Харчовай праграмы заслугоўвае асобнага асвятлення, у дадзеным артыкуле яна засталася па-за межамі аналізу. Былі і іншыя праблемы. Архіўная база заяўленай тэмы вузкая, вопісы і справы Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР за перыяд 1986–1991 гг., якія захоўваюцца ў сховішчах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, пакуль не маюць публічнага доступу.

**Пошук новай стратэгіі.** У 1985 г. у складзе партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва СССР адбыліся змены. У сакавіку 1985 г. на пасаду генеральнага сакратара ЦК КПСС быў абраны М. Гарбачоў. З гэтай нагоды ён пакляўся: «Абяцаю вам, таварышы, прыкласці ўсе сілы, каб аддана служыць нашай партыі, нашаму народу, вялікай ленінскай справе» [3, с. 133]. Пачаўся новы этап у гісторыі савецкай дзяржавы. У лютым 1986 г. адбыўся XXVII з'езд КПСС, які прыняў новую рэдакцыю трэцяй праграмы КПСС, накіраванай на ўдасканаленне сацыялізму, паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны [4, с. 139].

Аднак на гэты час кіраўніцтва КПСС не мела тэарэтычна распрацаванай мадэлі «ўдасканаленага сацыялізму» і шляхоў яго дасягнення ніхто не ведаў. Таму курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця таксама быў дэкларатыўна-аптымістычным. Кіраўніцтва М. Гарбачова не прадугледжвала ніякіх іншых альтэрнатыў і сцэнарыяў магчымага развіцця краіны.

Гэтая недальнабачная, абмежавана-памылковая пазіцыя партыйна-палітычнага кіраўніцтва ў далейшым адыграла рашаючую ролю ў лёсе савецкай дзяржавы. Калі напрыканцы 1988 г. высветлілася, што курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця не толькі не прыносіць

становучых вынікаў, але вядзе краіну да крызісу, ніякай альтэрнатыўнай праграмы дзейнняў у гарбачоўскага кіраўніцтва не было.

Такая ж сітуацыя была характэрная і для сельскай гаспадаркі. Разам з завяршэннем пераводу сельгасвытворчасці на індустрыяльную аснову трэба было правесці яе тэхнічную мадэрнізацыю. Асаблівая ўвага была звернута на інтэнсіфікацыю сельскай гаспадаркі. На XXVII з’ездзе было дэкларавана, што ключ да поспехаў – у шырокім прымяненні інтэнсіўных тэхналогій. У XII пяцігодцы намячалася болей чым у 2 разы ўзняць тэмпы росту сельгасвытворчасці. Разам з тым крыніцай папаўнення харчовага фонду было названа скарачэнне страт прадукцыі палёў і фермаў пры зборы, перапрацоўцы прадукцыі, яе захаванні, якія дасягалі да 20%, а па асобных відах прадукцыі – да 30% ад агульнага аб’ёму вытворчасці. Каб дамагчыся ўздыму вытворчасці, трэба было завяршыць пераход на новыя формы арганізацыі працы, адкрыць прастор для ўкаранення эканамічных метадаў гаспадарання, пашырыць самастойнасць, зацікаўленасць і адказнасць калгасаў і саўгасаў за канчатковыя вынікі працы. Дэкларавалася, што «шырокае выкарыстанне атрымаюць падрад і сістэма на ўзроўні брыгады, звяна, сям’і з замацаваннем за імі на дагаворны тэрмін сродкаў вытворчасці, уключаючы зямлю» [4, с. 31, 32]. Адным з абагульняючых паказчыкаў была прадукцыйнасць працы. За гады XII пяцігодкі меркавалася ўзняць прадукцыйнасць працы ў грамадскім сектары сельскай гаспадаркі на 21–23 % [4, с. 300].

**Сельскагаспадарчая галіна ў БССР.** У студзені 1986 г. адбыўся XXX з’езд КПБ. У цэлым змены ў сельскай гаспадарцы былі вызначаны як «пазітыўныя». Сярод галоўных праблем, якія абцяжарвалі эканамічнае становішча, было тое, што «рэспубліка не дабілася рашучага зруху ў інтэнсіфікацыі вытворчасці, павышэння яе эфектыўнасці». З 1971 па 1985 г. вартасць асноўных фондаў народнай гаспадаркі павялічылася ў 3,4 раза, а фондааддача за гэты перыяд – толькі на 29% [5, с. 12]. Не былі выкананы пяцігадовыя заданні Харчовай праграмы па аб’ёму вытворчасці мяса, малака, бульбы, льну, цукровых буракоў, усяго таго, на чым спецыялізавалася БССР [5, с. 12].

Сярод пазітыўных момантаў адзначалася, што сельская гаспадарка пераадолела «ўзнікшае ў пачатку пяцігодкі адставанне». Пасля прыняцця Харчовай праграмы і спісання крэдыторскай запазычанасці, у «спалучэнні з аказанай дзяржавай вялікай дапамогай», 1471 гаспадарка са стратных стала рэнтабельнай [5, с. 22]. Да негатыўных была аднесена тэндэнцыя запаволення тэмпаў развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці. Сярэднегадавы аб’ём валавой прадукцыі павялічыўся толькі на 8,3%, вытворчасць збожжа склала 89% ад запланаванай на пяцігодку, бульбы і мяса – 92, малака – 95%. У сувязі з гэтым у XII пяцігодцы было вырашана «забяспечыць больш высокія тэмпы прыросту прадукцыі», дзеля чаго патрабавалася, каб гаспадаркі перайшлі на інтэнсіўныя тэхналогіі [5, с. 21].

На з’ездзе было канстатавана, што ў большасці гаспадарак жывёлагадоўля «развіваецца экстэнсіўна», таму ставілася задача ўзняць жывёлагадоўлю на «якасна новы ўзровень». Дзеля гэтага паўсюдна на працягу аднаго-двух гадоў трэба было «перайсці на паточна-цэхавую сістэму вытворчасці малака... паўней рэалізаваць магчымасці спецыялізацыі і канцэнтрацыі жывёлагадоўлі» [5, с. 22–23].

**Наступствы катастрофы на ЧАЭС.** Адзначанае вышэй было прынята да красавіка 1986 г. 26 красавіка гэтага года адбылася катастрофа на Чарнобыльскай атамнай станцыі. Наступствы і вынікі гэтай катастрофы для сельскай гаспадаркі БССР былі выключна цяжкімі. У зоне радыеактыўнага забруджвання апынулася 2,6 млн квадратных кіламетраў тэрыторыі БССР, у тым ліку 1623 тыс. га зямель сельскагаспадарчага прызначэння, што складала прыкладна 18,1% усіх сельгасугоддзяў рэспублікі. У раёнах, якія падвергліся моцнаму радыеактыўнаму забруджванню, страты сельскагаспадарчых угоддзяў былі вельмі вялікімі. У Касцюковіцкім раёне яны скараціліся на 11%, Краснапольскім – на 11, Чэрыкаўскім – на 9, Слаўгародскім – на 6%. У гэтых раёнах найбольш пацярпелі пасяўныя плошчы збожжавых культур, якія скараціліся з 20 да 35% ад агульнага памеру пасеваў [6, арк. 2, 5, 6]. Гэтая работа працягвалася і ў 1990–1991 гг., калі з севазвароту былі выведзены тыя зямельныя тэрыторыі, якія былі забруджаны на 15 і болей Кі на квадратны кіламетр. Па гэтым паказчыку дадаткова было выведзена з севазвароту 318 тыс. га [7, арк. 64]. У выніку ўзмоцненага вапнавання глебы, якое праводзілася ў мэтах дэзактывацыі, глеба станавілася «непрыгоднай для вытворчасці лёну». Больш за тое, разам з карэннем лёну, радые-

актыўны пыл пераносіўся і на льнозаводы. Па гэтых прычынах вытворчасць лёну на 100% была спынена ў 15 раёнах Гомельскай і 7 раёнах Магілёўскай абласцей. Як канстатавалі спецыялісты Савета Міністраў БССР, у раёнах, размешчаных у забруджанай радыенуклідамі зоне, назіраюцца «сур'ёзныя складанасці з вырошчваннем, нарыхтоўкай і адгрузкай бульбы» [8, арк. 219]. У 1990 г. была спынена вытворчасць цукровых буракоў у Лунінецкім, Пінскім і Столінскім раёнах [7, арк. 65].

На 1 студзеня 1991 г. на забруджаных радыенуклідамі тэрыторыях у Гомельскай вобласці было ліквідавана 20 калгасна-саўгасных гаспадарак, эвакуіравана 50,9 тыс. галоў буйной рагатай жывёлы, 9,5 тыс. галоў свіней [7, арк. 22, 23]. Скарачэнне пасяўных плошчаў, вытворчасці цукровых буракоў, іншых кармавых культур, немагчымасць атрымліваць чыстую сельскагаспадарчую прадукцыю змянілі сітуацыю на спажывецкім рынку рэспублікі.

Вялікай праблемай было забеспячэнне жывёл кармамі. Для насельніцтва ўрад пастаўляў чыстую прадукцыю, а буйная рагатая жывёла пасвілася на атручаных радыенуклідамі выганах. І калі восенню 1986 г. пачалася ўборка бульбы, цукровых буракоў, усё гэта пайшло на свінагадоўчыя комплексы, што далей абярнулася вялікімі стратамі.

Сітуацыю абцяжарвала заслона сакрэтнасці, навязаная рэспубліцы кіраўніцтвам ЦК КПСС. На сакавіцкім (1989 г.) пленуме ЦК КПСС у дакладзе М. Гарбачова ўвогуле не была звернута ўвага на Чарнобыльскую катастрофу. На XXXI з'ездзе КПБ (1990 г.) рэспубліканскае кіраўніцтва прызналася: «Мы не змаглі з самага пачатку катастрофы паставіць сябе ў адносінах да ЦК КПСС і ўрада краіны так, каб намнога раней зняць з яе заслону сакрэтнасці... Выправіць памылкі, многія з якіх базіруюцца на няправільнай пазіцыі, недаацэнцы памераў і вынікаў трагедыі, можна толькі аператыўнымі, настойлівымі дзеяннямі» [26, с. 26, 27].

**Новая сістэма кіравання.** Настойлівых, аператыўных дзеянняў партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР не назіралася не толькі ў адносінах да ліквідацыі наступстваў Чарнобыльскай катастрофы. Выкананне дырэктыўных заданняў, прынятых у 1986 г., зацягвалася па прычыне таго, што вельмі марунда вырашалася пытанне стварэння новай сістэмы кіравання аграпрамысловым комплексам. Рашэнне па пераходу на новую сістэму кіравання было прынята яшчэ на майскім (1982 г.) пленуме ЦК КПСС. Пасля гэтага ў БССР пачалі ствараццa новыя структуры кіравання – раённыя (117) і абласныя (6) аграпрамысловыя аб'яднанні – РАПА і АблАПА. Усюды былі створаны і пачалі працаваць раённыя саветы гэтых аграпрамысловых структур. У БССР на мясцовым узроўні кіраўніцтва РАПА таксама ажыццяўлялі саветы гэтага аб'яднання. У склад раённага савета РАПА ў рэспубліцы ў сярэднім уваходзіла 42 чалавекі, 16 з іх былі кіраўнікамі калгасаў і саўгасаў, а 16 чалавек узначальвалі іншыя прадпрыемствы сістэмы АПК [1, с. 418]. На рэспубліканскім узроўні пачала працаваць Камісія Прэзідыума Савета Міністраў БССР па пытаннях аграпрамысловага комплексу.

Аднак партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва СССР не задавальняў даволі дэмакратычны падыход да фарміравання кіруючых структур РАПА. У іх цяжка было вызначыць адказных за справу. У пачатку красавіка 1985 г. М. Гарбачоў упершыню ў якасці кіраўніка партыі паставіў задачу «змяненння ў арганізацыйных структурах кіравання» АПК з тым, каб гэты комплекс «планаваўся, фінансаваўся і кіраваўся як адно цэлае» [3, с. 139,143]. Затым 14 лістапада 1985 г. была прынята пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым удасканаленні кіравання аграпрамысловым комплексам». У пастанове было прызнана неабходным «стварыць саюзна-рэспубліканскі Дзяржаўны аграпрамысловы камітэт СССР», які б з'яўляўся «цэнтральным органам» дзяржаўнага кіравання АПК. Аграпрамы саюзных рэспублік, якія ўзначальвалі іх старшыні, падпарадкоўваліся рэспубліканскім Саветам Міністраў. Аграпрамам былі перададзены структуры міністэрстваў сельскай гаспадаркі, плодаагародніннай гаспадаркі, мясной і малочнай прамысловасці, харчовай прамысловасці, сельскагаспадарчага будаўніцтва, камітэта па вытворча-тэхнічнаму забеспячэнню сельскай гаспадаркі [9, с. 274, 275, 276].

У лютым 1986 г. пачаў працаваць Дзяржаграпрам БССР, у склад якога ўвайшлі абласныя і раённыя аграпрамысловыя аб'яднанні. Акрамя гэтых структур у склад Дзяржаграпрама БССР увайшлі раённыя і абласныя дзяржаўныя інспекцыі па закупках, якасці прадукцыі, метралогіі і стандартызацыі, службы землекарыстання і землеўладкавання, дзяржаўныя інспекцыі па нагляду за тэхнічным станам машын і абсталявання, дзяржаўная ветэрынарная інспекцыя.

Стварэнне аграпрамысловага камітэта СССР, Дзяржаграпрама БССР не выпадкова заняло працяглы час. Гэтае рашэнне было дрэнна абгрунтаваным як з эканамічнага, так і арганізацыйнага пункту гледжання. У выніку аб'яднання вялікай колькасці прадпрыемстваў і арганізацый была створана вялізная, а разам з тым дрэнна прыстасаваная да аператыўнага кіравання эканамічная структура.

У 1990 г. у склад Дзяржаграпрама БССР уваходзілі 1641 калгас, 866 саўгасаў, 325 міжгасаў, 44 прадпрыемствы лясной гаспадаркі, 530 прамысловых прадпрыемстваў, 609 дзяржаўных кааператыўна-будаўнічых арганізацый, 752 прадпрыемствы гандлю і грамадскага харчавання, 116 транспартных, 162 забеспячальных, 157 нарыхтоўчых арганізацый, 300 ветэрынарных станцый. У АПК БССР налічвалася 48 прамысловых, 8 сельскагаспадарчых, 24 навукова-вытворчыя аб'яднанні, працавалі 3 аграпрамысловыя камбінаты, 3 аграпрамысловыя аб'яднанні, 30 аграфірм. Калі ў 1985 г. удзельная вага АПК у народнай гаспадарцы складала 38,1%, то ў 1990 г. яна ўзрасла да 39,9% [10, арк. 11 адв.]. У 1990 г. на долю АПК БССР прыпадала 44% валавой прадукцыі (у фактычных цэнах), 40% асноўных вытворчых фондаў, у комплексе было занята 1654 тыс. чалавек, ці кожны трэці, заняты ў вытворчай сферы дзейнасці [10, арк. 3 адв.].

Маруднасць у арганізацыі вытворчай дзейнасці з боку кіраўніцтва АПК БССР часткова тлумачылася запозненасцю прыняцця новага парадку планавання. Толькі ў чэрвені 1986 г. Дзяржплан СССР прыняў палажэнне аб парадку планавання развіцця аграпрамысловага комплексу СССР, на аснове якога было распрацавана і прынята палажэнне аб парадку планавання развіцця аграпрамысловага комплексу ў БССР на 1986–1990 гг. [11, арк. 51].

Але справа была не толькі ў гэтым. Самай складанай з усіх адміністрацыйна-кіраўніцкіх была праблема арганізацыі фінансавання і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння ўсіх структур АПК. Яна стваралася працяглы час. Адметнай асаблівасцю гэтай сістэмы з'яўлялася велізарная наменклатура вырабаў, якіх налічвалася каля 100 тыс. найменняў, вялікая колькасць пастаўшчыкоў (3 тыс.), шмат дробных спажыўцоў (14 тыс.), а таксама мноства аб'ектаў камплектавання абсталявання (звыш 5 тыс. будоўляў з аб'ёмам будаўніча-мантажных работ звыш 1,1 млрд руб.) [12, арк. 108–109]. Праца па стварэнні гэтай сістэмы была завершана ў сакавіку 1986 г., пасля гэтага можна было ажыццяўляць капіталаўкладанні, інвестыцыі, разгортваць зладжаную работу ўсяго комплексу АПК рэспублікі.

У сакавіку 1986 г. на пленуме ЦК КПБ яго першы сакратар М. Слюнькоў сказаў: «Мінула ўжо шмат часу з той пары, калі было прынята рашэнне па стварэнні АПК, а Дзяржаграпрам рэспублікі ўсё яшчэ фарміруе структуру кіравання, займаецца ўласным апаратам. Наспеў час заняцца практычнай дзейнасцю» [13, арк.18].

Гэты пленум акрамя планавых заданняў Харчовай праграмы прыняў рашэнне дамагчыся, каб у 1990 г. «усе гаспадаркі мелі рэнтабельнасць не менш за 25%» [13, арк. 122], што раней было вызначана праграмай «Інтэнсіфікацыя».

**Напрамкі рэфармавання сельскай гаспадаркі.** У 1988 г. адбылася XIX партыйная канферэнцыя. У сувязі з тым, што за 1986–1988 гг. эканоміка, а разам з ёю і сельская гаспадарка не выходзілі на паказчыкі XII пяцігодкі, было вырашана распачаць радыкальную эканамічную рэформу з тым, каб змяніць сістэму вытворчых адносін, а таксама планавую эканоміку на рэгулюемую рынкавую. У сельскай гаспадарцы было прызнана неабходным перайсці да ўкаранення розных формаў уласнасці на зямлю і сродкі вытворчасці. У чэрвені 1988 г. адбыўся пленум ЦК КПСС, які разгледзеў пытанне «Аб практычнай рабоце па рэалізацыі рашэнняў XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі». У дакладзе М. Гарбачова была нададзена ўвага і сельскай гаспадарцы. Было адзначана, што за 1986–1987 гг. сярэднегадовы кошт асноўных вытворчых фондаў у сельскай гаспадарцы СССР узрос у 2,7 раза, энергаўзброенасць працы – у 2 разы, фондаўзброенасць – болей чым у 3 разы ў параўнанні з 1971–1975 гг. Аднак у СССР аб'ём валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі з 1971 па 1987 г. узрос толькі на 25%, прычым вытворчасць збожжа – толькі на 16, цукровых буракоў – на 12, а зборы бульбы нават скараціліся на 9% [17, с. 15].

Яшчэ раз было падкрэслена, што барацьба са стратамі, поўнае захаванне атрыманай сельгаспрадукцыі могуць павялічыць рэсурсы харчавання краіны на 15–20% [17, с. 15]. Была зроблена вельмі важная выснова наконт прычын неэфектыўнасці капіталаўкладанняў: «Есць і адна агуль-

ная, галоўная, я б сказаў, прычына таго, што капітальныя ўкладанні, якія накіроўваюцца ў сельскую гаспадарку, у аграрны сектар, не даюць належнай аддачы, выкарыстоўваюцца неэфектыўна, а ў многіх выпадках проста замаруджваюцца. Яна заключаецца ў тым, што практычныя меры па ўмацаванні матэрыяльнай базы вёскі адначасова не падмацоўваліся адпаведнай работай па змяненні эканамічных адносін на вёсцы», – заявіў М. Гарбачоў [17, с. 15].

Наконт змянення эканамічных адносін, у тым ліку і на вёсцы, у новай рэдакцыі трэцяй праграмы КПСС увогуле нічога не адзначалася. Наадварот, там ішла размова аб неабходнасці ўмацавання і прымнажэння грамадскай уласнасці на сродкі вытворчасці. Таму адзначаная заява М. Гарбачова сведчыла як аб дэкларатыўнасці і адарванасці новай рэдакцыі партыйнай праграмы ад жыццёвай рэчаіснасці, так і аб яго адмове ад яе выканання. Больш таго, высветлілася, што ніякай канкрэтнай праграмы рэфармавання сельскай гаспадаркі на гэты момант у гарбачоўскага кіраўніцтва не было.

Не браўся ў разлік і назапашаны гістарычны вопыт. Як сведчыла гісторыя паслярэформеннага (1861 г.) пераходу на новыя формы гаспадарання і эканамічных узаемаадносін, гісторыя такога ж паслякастрычніцкага (1917 г.) пераходу, гэты працэс займаў працяглы перыяд – ён ахопліваў 20–30 гадоў. Гэты вопыт гарбачоўскім кіраўніцтвам не быў узяты пад увагу.

Ніякіх папярэдніх разлікаў па тэрмінах рэфармавання, яго наступствах зроблена не было. М. Гарбачоў заявіў, што прыйшла пара карэнным чынам змяніць эканамічныя адносіны на вёсцы з тым, каб селянін стаў сапраўдным гаспадаром на зямлі [17, с. 16]. Было ўдакладнена, што нельга абмяжоўвацца толькі ўвядзеннем гасразліку на ўзроўні калгаса і саўгаса, да гэтай формы гаспадарання трэба дадаць арэнду зямлі і сродкаў вытворчасці. Трэба, каб арэндныя формы вядзення сельскай гаспадаркі «шырока распаўсюдзіліся па краіне» [17, с. 17]. З гэтай мэтай было прапанавана распрацаваць і прыняць закон аб арэндзе.

У той жа час было заяўлена, што тормазам на шляху да пераходу на новыя формы гаспадарання з'яўляецца тагачасная сістэма адміністрацыйнага кіравання: «Зараз справа ўпіраецца ў кансерватыўныя пазіцыі кіраўнікоў і спецыялістаў калгасаў і саўгасаў». Таму было прапанавана стварыць умовы, якія б знялі гэтыя перашкоды. Адной з іх былі існаваўшыя кіраўніцкія структуры – РАПА. На гэты конт было адзначана: «Калі мы прызналі, што цяперашняя сістэма кіравання АПК асаблівага эфекту не прынесла і зжывае сябе, то і не трэба за яе трымацца». Было прапанавана замест РАПА пераходзіць да кааператыўных формаў вытворча-тэхнічнага і эканамічнага абслугоўвання гаспадарак. «Рэарганізацыю кіраўніцтва АПК не трэба зацягваць. Неабходна канчаткова рассячы ўсе гэтыя каналы... праз якія даюцца каманды зверху», – заключыў М. Гарбачоў [17, с. 18].

У выніку ў другой палове 1988 г. у сістэме АПК СССР узнікла сітуацыя страты кіравання. Сістэма кіравання ў форме РАПА, якая праіснавала толькі тры гады і якую цяжка было назваць «старой», была прызнана тормазам на шляху далейшага развіцця. Тым часам да стварэння нейкай іншай, асабліва на мясцовым узроўні, было яшчэ далёка. Трэба было распрацаваць новую нарматыўную базу, працэс ліквідацыі РАПА і пераходу на галіновую структуру кіравання сельскай гаспадаркай патрабаваў доўгага часу. Менавіта гэтыя моманты ў хуткім часе адыгралі адмоўную ролю ў гісторыі сельгасвытворчасці СССР, у тым ліку і БССР.

**Палітычныя рознагалоссі.** Рашэнне ліквідаваць РАПА не толькі з арганізацыйна-гаспадарчага, нават з палітычнага боку было дрэнна пралічаным і абгрунтаваным. Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва БССР не падзяляла меркаванні і ініцыятывы ЦК КПСС у адносінах да ліквідацыі РАПА. У кастрычніку 1988 г. адбыўся пленум ЦК КПБ. На гэтым пленуме Я. Сакалоў сказаў: «Нехта робіць заявы, што РАПА, маўляў, зжылі сябе. Гэта карэнным чынам недакладнае меркаванне» [18, арк. 26]. Як бачна, пазіцыя ЦК КПБ не супадала з пазіцыяй ЦК КПСС у пытанні далейшага лёсу РАПА. У БССР не гучалі заклікі да развалу кіравання АПК. Я. Сакалоў адзначыў, што ў рэспубліцы ў 1988 г. на арэндным падрадзе працавалі вытворчыя падраздзяленні амаль 50% гаспадарак [18, арк. 17]. Пры гэтым было вырашана, што на змену існаваўшым брыгадам у калгасах і саўгасах павінны прыйсці «арэндныя гасразліковыя калектывы». «Гасразлік – гэта гандаль, гандаль і яшчэ раз гандаль. Гэта камерцыйнае жыццё – гэта не пасада», – заключыў Я. Сакалоў [18, арк. 16]. У пастанове пленума была пастаўлена задача: «патрабаваць ад кіраўнікоў

і спецыялістаў гаспадарак больш настойлівай працы па ўкараненні арэндных формаў арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці» [18, арк. 117].

**Спробы пераходу на новы гаспадарчы механізм.** Калі Я. Сакалоў вёў гаворку пра гасразлік і арэндныя адносіны, ён засноўваўся на пэўных зрухах у арганізацыі працы ў калгасах і саўгасах. У студзені 1986 г. была прынята пастанова ЦК КПСС і СМ СССР «Аб далейшым удасканаленні эканамічнага механізма гаспадарання ў аграпрамысловым комплексе краіны». У гэтай пастанове прадугледжвалася на працягу «бліжэйшых двух гадоў» арганізаваць перавод усіх вытворчых падраздзяленняў калгасаў (з іх згоды), саўгасаў, перапрацоўчых і іншых прадпрыемстваў на ўмовы падраду і поўнага гаспадарчага разліку. Акрамя таго, гаспадаркі атрымалі права выкарыстоўваць сямейны падрад у раслінаводстве і жывёлагадоўлі «як адну з формаў гаспадарчага падраду» [19, арк. 36].

Пераход на поўны гаспадарчы разлік, укараненне арэндных формаў арганізацыі вытворчасці давалі магчымасць адысці ад метадаў адміністрацыйна-каманднай сістэмы кіравання вытворчасцю. Гэты адыход грунтаваўся на стварэнні новага гаспадарчага механізма, перадачы рычагоў кіравання вытворчасцю, у тым ліку сельскагаспадарчай, працоўным калектывам, якія з дапамогай выбараў свайго кіраўніцтва самастойна вызначалі ўсе кірункі вытворчай дзейнасці прадпрыемства. Гэта азначала, што «на рэспубліканскім узроўні органы кіравання, звязаныя з АПК, не могуць умешвацца ў гаспадарчую дзейнасць калгасаў і саўгасаў» [20, с. 33].

Самастойнасць кіраўніцтва дапаўнялася прынцыпам самафінансавання вытворчай дзейнасці за кошт яе прыбытковасці і рэнтабельнасці. Як было заяўлена, «рэальны шлях тут – пераход на аплату ад канчатковага выніку» [20, с. 24]. Калектывы прадпрыемстваў павінны былі спадзявацца толькі на выніку ўласнай працы. У тым ліку і ў аплаце працы.

У студзені 1987 г. Дзяржаграпрам БССР накіраваў на зацвярджэнне ў СМ БССР «Мерапрыемствы па пераводу калгасаў і саўгасаў рэспублікі на самаакупнасць і самафінансаванне». Да мерапрыемстваў быў дададзены «План пераводу калгасаў і саўгасаў на самаакупнасць і самафінансаванне на 1987–1990 гг.». Згодна з ім асноўная колькасць гаспадарак Брэсцкай вобласці – 205 з 372 – павінны былі завяршыць пераход на новы механізм гаспадарання ў 1989 г. Такая ж сітуацыя была і з гаспадаркамі іншых абласцей. У Гродзенскай вобласці з 311 гаспадарак у 1990 г. на самафінансаванне заставалася перавесці 36 калгасаў і 21 саўгас. Усяго ў 1990 г. па БССР з 2613 гаспадарак па плану заставалася перавесці на новы механізм гаспадарання толькі 327 гаспадарак (12,4% ад агульнай колькасці), з іх 200 калгасаў і 127 саўгасаў [21, арк. 44, 45].

Каб забяспечыць змены ў вышэйшых структурах кіравання эканомікай, 17 ліпеня 1987 г. была прынята пастанова ЦК КПСС і СМ СССР «Аб перабудове дзейнасці міністэрстваў і ведамстваў сферы матэрыяльнай вытворчасці ў новых умовах гаспадарання». Гэтая пастанова патрабавала ад кіраўніцтва міністэрстваў «карэнным чынам перабудаваць дзейнасць, змяніць ролю і функцыі», дзеля чаго было прадугледжана, што «гадавыя планы распрацоўваюцца і зацвярджаюцца прадпрыемствамі самастойна» [9, с. 420–426] і інш.

Калгасы і саўгасы атрымалі рэальнае права на самастойнасць. Арганізацыйна-кіраўніцкая самастойнасць павінна была дапаўняцца прынцыпам самафінансавання гаспадарчай дзейнасці. Дзеля гэтага 17 ліпеня 1987 г. была прынята пастанова ЦК КПСС і СМ СССР «Аб перабудове фінансавага механізма і павышэнні ролі Міністэрства фінансаў у новых умовах гаспадарання», у якой у п.3 было замацавана, што прадпрыемствы «самастойна распрацоўваюць і зацвярджаюць фінансавыя планы, у якіх вызначаюцца планавыя прапорцыі размеркавання прыбытку і даходаў, а таксама аб’ёмы расходаў» [9, с. 389]. Планавая самастойнасць дапаўнялася самастойнасцю прадпрыемстваў у размеркаванні заробкаў. 17 ліпеня 1987 г. была прынята пастанова ЦК КПСС і СМ СССР «Аб узмацненні працы па рэалізацыі актыўнай сацыяльнай палітыкі і павышэнні ролі Дзяржаўнага камітэта СССР па працы і сацыяльнай палітыцы». У п. 12 гэтай пастановы была замацавана норма: «не дапускаць ураўнілаўкі, забяспечыць абгрунтаваную дыферэнцыяцыю ў аплаце працы, не абмяжоўваць яе максімальныя памеры» [9, с. 440–441].

Аднак на практыцы пераход на новы механізм гаспадарання, прынцыпы самаакупнасці, самакіравання і самафінансавання ў арганізацыі вытворчага працэсу спрыялі развіццю эканамічных дысбалансаў перш за ўсё паміж узрастаннем прадукцыйнасці працы і заробкаў у галіне грамадскай вытворчасці, у тым ліку сельскагаспадарчай. Праз два гады пасля правядзення адпаведных

арганізацыйных мерапрыемстваў па ўкараненні калектыўнага падраду былі падведзены вынікі. У 1988 г. у БССР ва ўсіх тыпах вытворчых сельскагаспадарчых адзінак налічвалася 20399 брыгад (89% ад агульнай колькасці) і самастойных звёнаў, якія былі ахоплены калектыўным (брыгадным) падрадам. У іх было задзейнічана 634,3 тыс. чалавек (82% ад агульнай колькасці). За гаспадарча-разліковымі падраднымі брыгадамі было замацавана 92% ворыва, 82 – галоў буйной рагатай жывёлы, 80 – свіней, 83 – авечак і 77% птушкі. Удзельная вага валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі, якая была выраблена гэтымі брыгадамі і звёнамі, склала 88% ад агульнага аб'ёму вытворчасці валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі БССР [14, с. 88].

Аднак вынікі вытворчай дзейнасці гэтых калектываў былі негатыўнымі. У 1989 г. прыбытак сельскагаспадарчых прадпрыемстваў скараціўся ў параўнанні з 1988 г. на 5,4%, а ўзровень іх рэнтабельнасці знізіўся на 2,6% [23, арк. 36 адв.]. Падрадныя брыгады і звёны ў многіх гаспадарках ствараліся фармальна, г. зн. толькі «на паперы» дзеля справаздачнасці аб выкананні адпаведнай пастановы партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва.

Гэта тычылася і ўкаранення арэндных форм арганізацыі працы. У 1989 г. справаздачы аб выкарыстанні арэнднага падраду падалі 2166 калгасаў і саўгасаў рэспублікі (86,5% ад агульнай колькасці). Аднак праверкі паказалі, што «ў рэчаіснасці ў многіх гаспадарках арэндныя адносіны не адпавядаюць прынцыпам гаспадарчага разліку». У большасці з іх арэндныя дагаворы заключаліся на 1 год, свае разліковыя рахункі мелі толькі 6,3% арэндных калектываў, крэдытамі Аграпрамбанка СССР карысталіся толькі 3,1% арэндных калектываў [22, арк. 37 адв.].

Арэндныя калектывы, якія мелі свае разліковыя рахункі, бралі крэдыты, самастойна ажыццяўлялі вытворчую дзейнасць і фактычна не залежалі ад кіраўніцтва гаспадарак. Яны самастойна вызначалі памеры заробкаў членам сваіх калектываў, у тым ліку памеры бонусаў.

У такіх умовах рэгуляваць памеры заработнай платы ў гаспадарках, якія атрымалі права на самастойнасць, было амаль немагчыма. Налічэнне неабгрунтаваных заробкаў стала тыповай з'явай гаспадарчага жыцця. У многіх стратных калгасах рэспублікі расходы на выплату заработнай платы «перавысілі даход у 1,4 раза». У Віцебскай вобласці такіх гаспадарак было 19, Гродзенскай –21, Гомельскай – 89 [23, арк. 65]. Як бачна, кіраўніцтва шмат якіх калгасаў і саўгасаў аб выкананні вытворчых паказчыкаў клапацілася меней, чым аб сваіх заробках. У выніку фінансавыя спецыялісты АПК канстатавалі, што «магчымасць атрымання незаробленых сродкаў падрывае гасразлік, а фальсіфікацыя арэндных адносін дыскрэдытуе іх як прагрэсіўную форму вядзення гаспадаркі» [22, арк. 38].

У выніку тэмпы росту аплаты працы апераджалі рост прадукцыйнасці працы ў калгасах на 2,7%, саўгасах – на 4% [21, арк. 45]. Аднак, нягледзячы на гэта, па памерах заробкаў беларускія сяляне не займалі лідзіруючых пазіцый. У іншых рэспубліках гэты працэс быў больш радыкальным. У 1990 г. у СССР па памерах заробкаў калгасы БССР займалі 7-е месца. Калгаснікі Эстоніі атрымлівалі 352 руб. (1-е месца), Літвы – 303 (2-е месца), Латвіі – 301 (3-е месца), Арменіі – 273, Расіі – 265 руб. штомесячнага заробку [15, с. 69].

Пераход на новы механізм гаспадарання прадугледжваў увядзенне дзяржаўнага заказу на продаж прадукцыі сельскай гаспадаркі дзяржаве. Прадукцыю, якая заставалася пасля выканання дзяржзаказу, гаспадаркі мелі права прадаваць на рынку па дагаворных цэнах. Аднак у 1990 г. на XXXI з'ездзе КПБ прагучала рэзонная заўвага механізатара калгаса імя XXI з'езда КПСС Талачынскага раёна У. Чарнышова: «Аб якой самастойнасці можа ісці размова, калі дзяржаўны заказ на прадукцыю сельскай гаспадаркі зноў устанаўліваецца на 100 працэнтаў» [26, с. 77].

На нашу думку, пралікі і паспешліваць у рэалізацыі новага гаспадарчага механізма, яго эксперыментальная неадпрацаванасць у спалучэнні з абвастрэннем крызісу на спажывецкім рынку не дазволілі выкарыстаць дзяржзаказ у якасці інструменту новага эканамічнага механізма.

**Цэнавая палітыка.** Не меней складанай была праблема з цэнамі. Дасягненню высокіх вытворчых паказчыкаў перашкаджалі не толькі непрадуманыя і неабгрунтаваныя тэхналагічныя і арганізацыйныя перашкоды, якія пасля 1985 г. ствараліся гарбачоўскім кіраўніцтвам, але і дзеючыя эканамічныя фактары, перш за ўсё цэнавая палітыка дзяржавы.

Праблема цэн была прадметам абмеркавання на ўзроўні партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР. Беларускі філіял навукова-даследчага інстытута па цэнаўтварэнню Дзяржкамітэта цэн СССР

падрыхтаваў Дакладную запіску «Аб дынаміцы цэн на спажываемыя сельскай гаспадаркай БССР сродкі вытворчасці і рэалізуемую калгасамі і саўгасамі рэспублікі сельгаспрадукцыю за 1982–1988 гг.». Гэтая запіска за подпісам дырэктара гэтага філіяла Л. Кавалёва 13 сакавіка 1990 г. была накіравана ў Савет Міністраў БССР. У запісцы паведамлялася, што за адзначаны перыяд падаражанне сельскагаспадарчых машын для раслінаводства «на 72% было абумоўлена прамым узрастаннем цэн» на сродкі вытворчасці і на 28% «зрухамі ў структуры» асартыменту тэхнікі, што накіроўвалася ў раслінаводства. Структурныя зрухі былі значнымі. Яны забяспечылі 90%-нае падаражанне бульбасаджалак, 59%-нае – збожжаўборачных камбайнаў, 87%-нае – жатак, 78%-нае – касілак, 51%-нае падаражанне машын для ўнясення ўгнаенняў.

Акрамя сродкаў вытворчасці значнае падаражанне было зафіксавана і ў будаўніцтве. Кошт будаўніцтва птушкафабрык, гароднінасховішч, памяшканняў для буйной рагатай жывёлы і свіней, захоўвання збожжа, майстэрань, інфраструктуры і г. д. павялічыўся ў 2,16 раза, мінеральныя ўгнаенні падаражалі ў 2 разы, сродкі хімізацыі – на 62%. Як было канстатавана, сума прыросту рэалізаванай прадукцыі за кошт змянення закупачных цэн, якія прызначаліся для кампенсацыі падаражання сродкаў вытворчасці і паслуг, у 1988 г. складзе «толькі 68% падаражання тэхнікі, аб’ектаў капітальнага будаўніцтва, мінеральных угнаенняў, камбікармоў і паслуг». Абсалютная сума страт сельскай гаспадаркі рэспублікі ад падаражання сродкаў вытворчасці ў 1988 г., у параўнанні з 1982 г. склала 163 тыс. руб. на адно сельгаспрадпрыемства. Падаражанне ўсіх элементаў асноўных фондаў «значна абясцэніла прырост капітальных укладанняў калгасаў і саўгасаў за 1982–1988 гг.». Па гэтай прычыне кошт трактарнага парка ў сельскай гаспадарцы БССР за гэты перыяд узрос у 1,84 раза, а агульная колькасць трактароў скарацілася на 6%. Эканамічны аналіз спецыялістаў засведчыў, што «ўзрастанне сабекошту сельскагаспадарчай вытворчасці на 50% было звязана з павышэннем затрат на амартызацыю, мінеральныя ўгнаенні, камбікармы, гаручазмазачныя матэрыялы» [24, арк. 94–99].

У запісцы змяшчаліся выніковыя высновы. Яны былі вельмі красамоўнымі: «Цэнавая палітыка ў галіне сельскай гаспадаркі БССР за разглядаемы перыяд была накіравана на адноснае зніжэнне даходнасці раслінаводства і скарачэнне яго долі ў агульным аб’ёме рэалізаванай прадукцыі аграрнага сектара... Пераход БССР на самакіраванне і самафінансаванне ажыццяўляецца ў нявыгадных для рэспублікі ўмовах» [24, арк. 100]. Гэта азначала, што дзяржаўная цэнавая палітыка была накіравана на асэнсаваную эксплуатацыю сельскай гаспадаркі рэспублікі на карысць гарадской прамысловасці, а дакладней, развіццё прамысловасці ў СССР і БССР шмат у чым забяспечвалася за кошт неэквівалентнага абмену паміж горадам і вёсай, эксплуатацыі сельскай гаспадаркі.

Цэнавая палітыка дзяржавы доўгі час не была накіравана на развіццё вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Павышэнне рэнтабельнасці сельскай гаспадаркі БССР у 1990 г. было вынікам павышэння закупачных цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю.

**Радыкалізацыя аграрнай рэформы. Разбурэнне сістэмы кіравання АПК.** Кіраўніцтва ЦК КПСС не жадала разгортваць «настойлівую працу» на месцах па ўкараненні новага механізма гаспадарання. Не завяршыўшы адну справу, яно выступіла з новымі ініцыятывамі і прапановамі. У сакавіку 1989 г. адбыўся пленум ЦК КПСС, на якім было разгледжана пытанне «Аб аграрнай палітыцы партыі ў сучасных умовах». З дакладам выступіў М. Гарбачоў. Спачатку ён адзначыў: «Рэчаіснасць такая, што прадукцыі сельскай гаспадаркі нам не хапае... усе нашы меры – а сярод іх былі вельмі сур’ёзныя – не далі жаданых вынікаў». Пасля гэтага ён удакладніў пазіцыю ЦК КПСС па аграрнай палітыцы: «На думку Палітбюро, ключавое пытанне сучаснай аграрнай палітыкі – карэннае пераўтварэнне эканамічных адносін у вёсцы ... Мы павінны рашуча пераадолець адчужэнне сельскіх працаўнікоў (як зрэшты і ўсіх працоўных) ад уласнасці, якая належыць ім пакуль толькі фармальна ... Мы павінны адкрыць шырокую дарогу самым разнастайным формам гаспадарання – і калгасам, і саўгасам, і аграфірмам, і агракамбінатам, і сялянскім, і асабістым падсобным гаспадаркам, і аграцэхам прамысловых, будаўнічых і іншых неаграрных прадпрыемстваў, і падсобным промыслам ... Мы павінны ясна ўяўляць, што без рэформы цэн, усёй сістэмы цэнаўтварэння немагчыма рэалізаваць задачы перабудовы эканомікі» [20, с. 7–27].

М. Гарбачоў выступіў за «ліквідацыю існуючай адміністрацыйнай (ведамаснай і тэрытарыяльнай) сістэмы кіраўніцтва сельскай гаспадаркай і аграрным сектарам эканомікі ў цэлым». У сувязі з гэтым было прапанавана «скасаваць РАПА там, дзе яны яшчэ засталіся» [20, с. 32, 33].

Стварэнне ўжо не новага, а іншага гаспадарчага механізма, заснаванага на разнастайных формах гаспадарання, патрабавала значнага часу. Неабходна было падрыхтаваць нарматыўна-прававую базу, правесці шэраг мерапрыемстваў па ўкараненні арэндных форм гаспадарання, стварэнні новых кіраўніцкіх структур, асабліва на мясцовым узроўні. На гэты конт было дэкларавана: для таго, каб іншы гаспадарчы механізм пачаў працаваць, «непазбежны пераходны перыяд», у рамках якога павінны выкарыстоўвацца розныя формы матывацыі дзейнасці сельгасвытворцаў, уключаючы дзяржаўны заказ [20, с. 26].

Вельмі вострым было пытанне далейшага лёсу нізкарэнтабельных і стратных калгасаў. Было прапанавана ў адносінах да тых гаспадарак, «якія страцілі перспектывы самастойнага развіцця», выкарыстаць «радыкальныя меры». Фактычна гэта азначала ліквідацыю такіх калгасаў шляхам перадачы іх зямлі паспяховым і рэнтабельным гаспадаркам, калектыўным і сямейным арандатарам, іншым прадпрыемствам для развіцця падсобных промыслаў, а таксама сялянскім гаспадаркам. Вырашэнне праблемы нізкарэнтабельных і стратных калгасаў планавалася завяршыць «ужо ў бліжэйшыя год-два» [20, с. 29]. Адпаведна і пераходны перыяд павінен быў ахапіць гэты тэрмін.

Такім чынам, сакавіцкі (1989 г.) пленум ЦК КПСС распрацаваў і прыняў да выканання «новую аграрную палітыку» [20, с. 56]. На нашу думку, адзначаныя вышэй кірункі гэтай палітыкі шмат у чым «пераклікаліся» і нават супадалі з такімі ж кірункамі аграрнай палітыкі, якая праводзілася ў гады НЭПа. Да прыкладу, ідэя шматукладнасці формаў гаспадарання на зямлі, выкарыстання арэнды, матывацыі і развіцця сялянскіх гаспадарак на фермерскай аснове, стымулявання канкурэнцыі, магчымасць для сельгасвытворцаў прадаваць частку сваёй прадукцыі на рынку па свабодных цэнах – усё гэта мела месца ў сельскай гаспадарцы БССР перыяду НЭПа.

Рашэнні, прынятыя на сакавіцкім (1989 г.) пленуме ЦК КПСС, шмат у чым былі дэкларатыўнымі. Яны не былі падмацаваны мерамі эканамічнага характару, дадатковымі матэрыяльна-тэхнічнымі рэсурсамі і навуковым забеспячэннем.

**Рашэнні беларускага кіраўніцтва.** Пасля таго, як адбыўся сакавіцкі пленум ЦК КПСС, партыйна-дзяржаўнаму кіраўніцтву БССР трэба было вызначыцца ў адносінах да яго рашэнняў. З гэтай мэтай у маі 1989 г. была склікана нарада Камісіі ЦК КПБ па аграрных пытаннях, дзе былі абмеркаваны ўсе ініцыятывы гарбачоўскага кіраўніцтва ў кірунку радыкалізацыі аграрнай палітыкі. Ад імя бюро Гродзенскага абкама партыі яго сакратар В. Рудзячэнка сказаў: «Думка бюро абкама – не чапаць сістэму, якая склалася, РАПА. Справа не ў назве. Наша рэспубліка, у тым ліку Гродзенская вобласць, працуюць нармальна...». Яшчэ больш рашучым быў старшыня Мінскага аблаграпрама А. Жук, які падкрэсліў: «Рэспубліка можа абысці рашэнні Пленума ЦК КПСС. Калі забраць у нас базы забеспячэння, то гэта будзе злачынства перад сялянствам, таму што ўсё створана на касцях калгасаў і саўгасаў... Усё, створанае на ўзроўні рэспублікі, ламаць практычна не трэба». У выступленні першага сакратара ЦК КПБ Я. Сакалова прагучала заява: «Той, хто мяркуе, што сёння можна раздаць калгасы і саўгасы, робіць памылку, уводзіць у зман» [25, арк. 11–36]. Большасць удзельнікаў нарады выказаліся за захаванне ў рэспубліцы кіруючых структур аграпрамысловага камітэта. Гэтая пазіцыя аграрнай Камісіі ЦК КПБ разыходзілася з рашэннямі сакавіцкага пленума ЦК КПСС.

Але незадаволенасць перабудовай, крытыка непрадуманых, паспешлівых і наўмысна-разбуральных гарбачоўскіх ініцыятыў разам з нарастаннем эканамічнага крызісу і ціску на КПБ з боку народных мас прымусілі партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва дзейнічаць больш рашуча.

На XXXI з’ездзе КПБ, які адбыўся 28 лістапада – 1 снежня 1990 г., рашэнні гарбачоўскага палітбюро, сакавіцкага (1989 г.) пленума ЦК КПСС, XXVIII з’езда КПСС таксама былі падвергнуты аргументаванай крытыцы. Асаблівая ўвага была нададзена характарыстыцы «адчувальных вынікаў» гарбачоўскай палітыкі. У дакладзе першага сакратара ЦК КПБ Я. Сакалова прагучала: «Сёння трэба самакрытычна прызнаць, што ЦК КПБ, яго Бюро, а разам з ім урад рэспублікі не змаглі ўстаяць перад дыктатам цэнтра, дзейнічаць самастойна, насуперак ідучым адтуль непаслядоўным рашэнням і рэкамендацыям... Скараспелыя, непаслядоўныя рашэнні па шматзменцы,

дзяржпрыёмцы, пераводу прадпрыемстваў на гаспадарчы разлік таксама не далі жаданых вынікаў» [26, с. 12].

Выступаючы на з’ездзе, Старшыня Савета Міністраў БССР Ф. Кебіч заявіў: «У наяўнасці поўная дыстрафія, калі не параліч выканаўчай улады... Мы з велізарнымі цяжкасцямі распрацавалі праграму пераходу да рынку, таму што іншыя спосабы стварыць больш сацыяльна арыентаваную і эфектыўную эканоміку проста вычарпаны. Вопыту ў гэтай выключна складанай справе ў нас практычна няма ніякага, ідзём, што называецца, навобмацак» [26, с. 116, 117].

У сувязі з гэтым было заяўлена, што «Кампартыя Беларусі павінна смела і рашуча ўзяць на сябе ўсю паўнату адказнасці за вырашэнне задач, якія стаяць перад рэспублікай» [26, с. 18]. Гэта тычылася найперш самых вострых пытанняў: мэтаў і далейшых шляхоў рэфармавання эканомікі. Першы сакратар ЦК КПБ Я. Сакалоў заявіў: «Мы не пойдзем з тымі, хто абсалютызуе рынак, адмаўляецца ад рэгулюючай ролі дзяржавы ў яго фарміраванні, праз яго мае на мэце капіталізацыю грамадства. Наша лінія ...супраць прыватнай уласнасці на зямлю... за прыняцце законаў Беларускай ССР аб прыярытэтным сацыяльна-эканамічным развіцці аграпрамысловага комплексу... а таксама Дзяржаўнай праграмы адраджэння беларускай вёскі» [26, с. 22, 24, 30].

Курс на ліквідацыю калгасаў і саўгасаў не дыскутаваўся і не разглядаўся. На XXXI з’ездзе была прынята «Пазіцыя і Праграма дзеянняў Кампартыі Беларусі ў сувязі з пераходам рэспублікі на рыначныя адносіны». Паколькі КПБ з’яўлялася часткай КПСС і не мела ўласнай палітычнай праграмы, прыняцце XXXI з’ездам «Пазіцыі» азначала рашучы паварот партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР да суверэнітэту і незалежнасці. На нашу думку, прыняцце такога незвычайнага і выключнага для ЦК КПБ дакумента, як «Пазіцыя», сведчыла, што партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва Савецкай Беларусі фактычна перайшло ў апазіцыю да гарбачоўскага кіраўніцтва. З гэтага моманту КПБ не была абавязана падтрымліваць кіраўніцтва ЦК КПСС, як таго патрабаваў партыйны статут.

**Сельскагаспадарчыя кааператывы.** Згодна з палітычным курсам, прынятым на XIX партыйнай канферэнцыі, накіраваным на развіццё «розных формаў кааперацыі», у БССР пачалі ствараца сельскагаспадарчыя кааператывы. Дзяля таго, каб гэты працэс набіраў абароты, у пастанове ЦК КПСС аб перабудове дзейнасці міністэрстваў і ведамстваў ад 17 ліпеня 1987 г. была замацавана норма, згодна з якой яны былі «абавязаны садзейнічаць стварэнню і развіццю кааператываў» на падкантрольных прадпрыемствах. Закон СССР «Аб кааперацыі» быў прыняты 26 мая 1988 г.

Кааператывы ў большасці ствараліся на прадпрыемствах. Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва БССР адсочвала сітуацыю ў галіне кааператыўнага будаўніцтва. У кастрычніку 1990 г. кіраўніцтва Дзяржкамстата БССР падрыхтавала Аналітычную запіску «Аб развіцці кааператываў у сельскай гаспадарцы БССР» і накіравала яе ў Дзяржплан БССР. У запісцы паведамлялася, што на 1 чэрвеня 1990 г. у БССР было зарэгістравана 174 сельскагаспадарчыя кааператывы, з іх 122 ажыццяўлялі вытворча-гаспадарчую дзейнасць. У гэтых кааператывах налічвалася 1550 працоўных месцаў, у тым ліку 477 чалавек (31%) працавалі па сумяшчальніцтву. У сярэднім на 1 кааператыў прыпадала 13 працуючых [27, арк. 1–26].

Тыповай з’явай кааператыўнага руху была «патранатная» залежнасць ад сваіх вытворчых гаспадароў. Гэтымі гаспадарамі былі сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, выканкамы мясцовых Саветаў, прамысловыя і будаўнічыя прадпрыемствы і арганізацыі. Асноўная колькасць кааператываў – 40% – была створана і працавала «пры сельскагаспадарчых прадпрыемствах», 18 – пры прамысловых прадпрыемствах і будаўнічых арганізацыях, 10 – пры арганізацыях спажывецкай кааперацыі, 10 – пры выканкамах мясцовых Саветаў і толькі 10% кааператываў дзейнічалі самастойна [27, арк. 2].

Арэндавалі зямлю ў гаспадарках 46% кааператываў, 26 – бралі зямлю ў арэнду на вызначаны тэрмін, 6 – афармлялі дакументы на правa валодання зямельным участкам, 22% кааператываў зямлі не мелі, яны аказвалі гаспадаркам паслугі. Вытворчая дзейнасць кааператываў паступова атрымлівала спецыялізацыю. Як правіла, гэтая спецыялізацыя не адрознівалася ад спецыялізацыі той гаспадаркі, пры якой яны ствараліся. На вырошчванні гародніны спецыялізаваліся 23 кааператывы, 20 – гадавалі жывёлу і птушку, 10 – займаліся насенняводствам сельскагаспадарчых

культур, 8 – вырошчваннем кветак і грыбоў, 10 кааператываў выраблялі іншую сельскагаспадарчую прадукцыю [27, арк. 2].

За кааператывамі было замацавана 1389 га зямлі, у тым ліку 878 га ворыва. У сярэднім на адзін кааператыў прыпадала па 17,6 га сельгасугоддзяў і па 11,1 га ворыва. Збожжавымі культурамі ў 1990 г. было занята 56,9% агульнай пасяўной плошчы, на долю бульбы і гародніны прыпадала 15%, кармавых культур – 28,4% пасяўной плошчы. На аднаго занятага ў сельскай гаспадарцы працаўніка кааператыва прыпадала 0,79 га плошчы пасеву збожжавых культур, 0,15 га бульбы і 0,27 га плошчы пасеву кармавых культур. У наяўнасці кааператывы мелі 64 трактары, з якіх 42 былі іх уласнасцю, а астатнія арандаваліся ў гаспадарках, з 49 грузавых аўтамабіляў кааператываў толькі 4 былі арандаванымі. На 1 ліпеня 1990 г. у кааператывах налічвалася 630 галоў буйной рагатай жывёлы, з іх 297 галоў (47%) вырошчваліся па прынцыпу арэнднага падраду. Кааператывы даглядалі 1785 галоў свіней, у тым ліку 600 галоў (34%) на арэндзе [27, арк. 3]. У 1989 г. кааператывы вырабілі 166 т збожжа, 497 т бульбы, 365 т гародніны, 161 т мяса жывёл і птушкі (у жывой вазе), 320 т малака. Сваю прадукцыю кааператывы рэалізавалі, як правіла, у асноўным прадпрыемствам і арганізацыям, пры якіх яны былі створаны. Частку прадукцыі прадавалі спажывецкай кааперацыі і на калгасных рынках. У 1989 г. 55,5% атрыманай бульбы, 70,3 – гародніны, 36,7 – мяса, 65,7 – малака, 73,8% збожжа кааператывы прадалі дзяржаве, а на рынках было рэалізавана 16,3% мяса, 21 – гародніны, 36,7 – бульбы, 23,2% пладоў і ягад. Аналагічная тэндэнцыя захавалася [27, арк. 4, 5] і ў першым паўгоддзі 1990 г.

Асноўнай фінансавай крыніцай кааператываў былі прадпрыемствы. Як паведамляў намеснік Старшыні Дзяржкамстата БССР П. Лышчынскі, усе неабходныя сродкі кааператывы «атрымлівалі ў прадпрыемствах, пры якіх былі створаны», таму 57% кааператываў не карысталіся крэдытамі банкаў [27, арк. 5].

**Сялянскія (фермерскія) гаспадаркі.** Дэклараванне пераходу да «новай аграрнай палітыкі», якое адбылося на XIX партыйнай канферэнцыі, сакавіцкім (1989 г.) пленуме ЦК КПСС, абумовіла распрацоўку і прыняцце новых заканадаўчых актаў, якія рыхтаваліся працяглы час. Закон «Аб арэндзе» быў прыняты 23 лістапада 1989 г., Закон «Аб уласнасці ў СССР» – 6 снежня 1990 г.

У БССР у снежні 1990 г. быў прыняты «Кодэкс аб зямлі», 12 снежня 1990 г. – Закон «Аб арэндзе», 18 лютага 1991 г. – Закон «Аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы». «Кодекс аб зямлі» быў уведзены ў дзеянне з 1 студзеня 1991 г. У арт. 67 гэтага кодэкса была замацавана норма, згодна з якой грамадзяне атрымалі права на зямельны надзел у памеры да 50 га для «вядзення сялянскай гаспадаркі». З гэтай мэтай мясцовымі ўладамі ствараўся спецыяльны зямельны фонд, зямельныя надзелы, якія сяляне атрымлівалі для вядзення сваёй гаспадаркі, «раздзелу не падлягалі» [28, с. 59–72]. У ліпені 1991 г. быў прыняты Закон БССР «Аб прадпрымальніцтве ў Беларускай ССР», згодна з якім прадпрымальнікі, у тым ліку і фермеры, мелі права «атрымліваць любы, не абмежаваны па памерах, асабісты даход» [29, с. 41–44].

Гэтыя і шэраг іншых законаў і пастаноў урада БССР стварылі прававую базу для пераходу на новыя прынцыпы землекарыстання і землеваладання. На 1 студзеня 1992 г. у мясцовых (раённых) Саветах было зарэгістравана 759 сялянскіх гаспадарак. Іх колькасць за перыяд з 1 ліпеня па 30 снежня 1991 г. павялічылася ў 1,7 раза. У сярэднім па рэспубліцы на 10 калгасаў прыпадала 3 сялянскіх гаспадаркі (у Расіі – 20, ва Украіне – 2). Плошча зямельных надзелаў, якія атрымалі сялянскія гаспадаркі, склала 15,3 тыс. га, ці па 21 га ў разліку на адну гаспадарку. Пры гэтым 8% сялянскіх гаспадарак мелі не болей за 2 га зямлі, 37% – звыш 20 га (у Расіі на адну гаспадарку прыпадала па 42 га, ва Украіне – па 19 га). Размеркаванне зямлі па абласцях было розным. У Віцебскай і Магілёўскай абласцях на адну гаспадарку прыпадала па 25 га зямлі, у Гомельскай – па 21 га, Мінскай – па 20 га, Гродзенскай – па 14, а ў Брэсцкай – па 7 га зямлі [16, арк. 1].

Невялікія памеры зямельных надзелаў, якія атрымлівалі сялянскія гаспадаркі, былі абумоўлены наяўнасцю працаздольных рабочых рук. Сялянскія (фермерскія) гаспадаркі мелі права апрацоўваць зямлю з дапамогай блізкіх сваякоў. З мэтай вывучэння эканамічных магчымасцей і перспектыў развіцця гэтай формы землекарыстання на працягу 1991 г. было праведзена абследаванне 397 сялянскіх гаспадарак, якія працавалі ўвесь год. У разліку на адну гэтую гаспадарку

прыпадала 18 га зямлі, фермеры ўтрымлівалі па 4 галавы буйной рагатай жывёлы і свіней, па 3 галавы авечак. У іх карыстанні было 404 трактары, але 33% гаспадарак не мелі ні трактароў, ні мотаблокаў, 81% фермераў не мелі грузавых аўтамабіляў, 82% – не мелі коней. Таму толькі 10% фермераў утрымлівалі па 10 і болей галоў буйной рагатай жывёлы, болей за 10 галоў свіней утрымлівалі 5% фермераў [16, арк.2].

Структура пасяўных плошчаў была зарыентавана на вытворчасць кармавых культур, пад іх было занята 44%, збожжавыя займалі 42, бульба – 11, гародніна – 1,1, лён – 1,2% агульнай пасяўной плошчы. За 1991 г. абследаваныя фермерскія двары рэалізавалі 1,1 т мяса ў жывой вазе, 3,7 т малака, 10,7 т бульбы, 8,5 т збожжа, 1,0 т гародніны [16, арк. 2].

Фінансавае становішча фермерскіх гаспадарак было абумоўлена магчымасцю атрымання банкаўскіх крэдытаў. У 1991 г. адзначаныя 397 фермерскіх гаспадарак атрымалі 10,3 млн руб. крэдытаў, па 26 тыс. руб. на кожную гаспадарку, прычым 80% крэдытаў былі доўгатэрміновымі. Гэта быў вельмі важны інструмент дзяржаўнай падтрымкі сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак. Крэдытныя пазыкі дазвалялі фермерскім дварам набываць машынна-трактарную тэхніку, насенне, будаваць вытворчыя і жыллёвыя памяшканні. Расходы фермерскіх гаспадарак за 1991 г. склалі каля 11 млн руб. На набыццё сельгастэхнікі і абсталявання было затрачана 50% гэтых грошай, 17% грошай – на будаўніцтва жылля і вытворчых памяшканняў, 17% сродкаў было накіравана на набыццё насення, угнаенняў, гаруча-змазачных матэрыялаў. Агульная сума фонду заработнай платы склала каля 283 тыс. руб., ці 3% ад усіх расходаў. У разліку на адну гаспадарку было атрымана каля 7 тыс. руб. прыбытку [16, арк. 2, 3].

Самай вялікай праблемай для сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак было набыццё машынна-трактарнай тэхнікі, а таксама механізацыя вытворчых працэсаў, паколькі ўсе вытворчыя аперацыі ў жывёлагадоўлі забяспечваліся ручной працай. Напрыклад, вытворчыя памяшканні толькі 33% фермерскіх гаспадарак былі забяспечаны вадой, 63 – электраэнергіяй, 30 – тэлефоннай сувяззю, 50% – добрымі ўнутрыгаспадарчымі і пад'язднымі дарогамі [16, арк. 3], а астатнія не мелі ніякіх сродкаў механізацыі. У такой сітуацыі сялянскія (фермерскія) гаспадаркі не маглі скласці рэальнай альтэрнатывы калгасам і саўгасам, яны павінны былі прайсці доўгі шлях эвалюцыйнага развіцця і прыстасавання да сучаснай вытворчасці. З улікам эканамічных і сацыяльных страт не мела перспектыў палітыка, накіраваная на хуткі падзел маёмасці і разбурэнне калгасаў і саўгасаў.

**Заключэнне.** Такім чынам, даследаванне гісторыі перабудовы – адна з актуальных праблем беларускай гістарыяграфіі. Айчыннымі гісторыкамі пакуль не назапашана навуковых прац у фармаце дысертацый ці манаграфій па гісторыі перабудовы, у тым ліку і па гісторыі развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці.

Курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця СССР, прыняты ў 1986 г., быў дэкларатыўна-аптымістычным. Гарбачоўскае кіраўніцтва не прадугледжвала ніякіх іншых сцэнарыяў і кірункаў магчымага развіцця краіны. Гэтая недальнабачная, абмежавана-памылковая пазіцыя партыйна-палітычнага кіраўніцтва ў далейшым адыграла рашаючую ролю ў лёсе савецкай дзяржавы. Калі напрыканцы 1988 г. высветлілася, што курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця не толькі не прыносіць станоўчых вынікаў, але вядзе краіну да крызісу, ніякай альтэрнатыўнай праграмы дзеянняў у гарбачоўскага кіраўніцтва не было.

Такая ж сітуацыя была характэрна і для сельскай гаспадаркі. Працэс пераводу сельскай гаспадаркі на новы эканамічны механізм, арганізацыю вытворчасці, заснаваную на прынцыпах самакіравання і самафінансавання, праходзіў супярэчліва. Вопыту вядзення вытворчасці на аснове арэнднай арганізацыі працы ў гаспадарках не было. Не існавала і адпаведнай праваюй базы. Гэта адкрывала шляхі для рознага роду злоўжыванняў. Частка адміністрацыйна-кіраўніцкага персаналу калгасаў і саўгасаў не была зацікаўлена ва ўкараненні гасразліку і арэнды. Цэнавая палітыка дзяржавы доўгі час не матывавала развіццё вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Павышэнне рэнтабельнасці сельскай гаспадаркі ў БССР у 1990 г. было вынікам павышэння закупачных цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю. Аднак нягледзячы на цяжкасці, абумоўленыя наступствамі катастрофы на ЧАЭС, сельская гаспадарка ў Савецкай Беларусі павольна развівалася. Уваход у паласу крызісу пачаўся ў другой палове 1990 г.

Матэрыяльнай базай арганізацыі і развіцця кааператыўнага руху былі ў асноўным калгасы і саўгасы. Дзейнасць вытворчых кааператываў, якія былі створаны ў сельскай гаспадарцы, будавалася на прынцыпах арэнды. Развіццё кааперацыі, пабудаванай на фінансавым «утрыманні» кааператываў з боку калгасаў і саўгасаў, было адным з кірункаў гарбачоўскай палітыкі па ліквідацыі апошніх. На вёсцы такія кааператывы з'яўляліся крыніцай развіцця сацыяльных супярэчнасцей, яны выклікалі незадаволенасць калгаснікаў аграрнай палітыкай кіруючай партыі.

У Беларусі сялянскія (фермерскія) гаспадаркі не маглі скласці рэальнай альтэрнатывы калгасам і саўгасам, яны павінны былі прайсці доўгі шлях эвалюцыйнага развіцця і прыстасавання да сучаснай вытворчасці. У рэспубліцы не мела перспектывы і палітыка, накіраваная на хуткі падзел калгаснай маёмасці і разбурэнне калгасаў і саўгасаў.

У 1990 г. партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва БССР адмовілася праводзіць палітыку гарбачоўскай перабудовы, была выпрацавана ўласная праграма далейшых сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, заснаваная на ідэі паступовага пераходу да сацыяльна арыентаванай рэгулюемай рынычнай эканомікі. Пасля гэтага партыйна-дзяржаўныя інстытуты Савецкай Беларусі фактычна перайшлі ў апазіцыю да гарбачоўскага кіраўніцтва. Гэта была прынцыповая лінія беларускай партыйна-дзяржаўнай эліты, якая ў далейшым наклала адбітак на беларускія падзеі 19–25 жніўня 1991 г.

## Літаратура


1. Гісторыя Беларусі: у 6т./ рэдкал: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2011. – Т. 6: Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]. – 646 с.

2. *Сакович, В. С.* Сельское хозяйство Республики Беларусь в 1980–2007 гг.: тенденции развития / В. С. Сакович. – Минск: Беларус. наука, 2008. – 449 с.

3. *Горбачев, М. С.* Избранные речи и статьи. Т. 2 / М. С. Горбачев. – М.: Политиздат, 1987. – 510 с.

4. Материалы XXVII съезда КПСС. – М.: Политиздат, 1986. – 352 с.

5. Матэрыялы XXX з'езда Камуністычнай партыі Беларусі. 30–31 студзеня 1986 г. – Мінск: Беларусь. – 223 с.

6. Аналитические записки Госкомстата БССР, направленные Госплану БССР // НАРБ. – Ф. 30. – Воп. 13. – Спр. 1743.

7. Пояснительная записка к государственному плану экономического и социального развития БССР на 1991 г. // НАРБ. – Ф. 31. – Воп. 15. – Спр. 1846.

8. О поставках сельскохозяйственной продукции в союзный фонд // НАРБ. – Ф. 7. – Воп. 10. – Спр. 2183.

9. КПСС о перестройке: Сборник документов / Ин-т марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. – М.: Политиздат, 1988. – 642 с.

10. Статистический сборник «О развитии агропромышленного комплекса БССР, 1990 г.» // НАРБ. – Ф. 30. – Воп. 13. – Спр. 1622.

11. Поручения СМ БССР о рассмотрении проекта «Положения о порядке планирования развития агропромышленного комплекса БССР» // НАРБ. – Ф. 31. – Воп. 15. – Спр. 868.

12. Докладная записка Председателя Госагопрома БССР Ю. Хусаинова «Об организации материально-технического снабжения агропромышленного комплекса Белоруссии» // НАРБ. – Ф. 4-п. – Воп. 156. – Спр. 656.

13. Протокол № 2 заседания Пленума ЦК КПБ от 15 марта 1986 г. // НАРБ. – Ф. 4-п. – Воп. 160. – Спр. 386.

14. БССР в цифрах, 1988 год. Краткий стат. сб. / Госполитиздат БССР. – Минск: Беларусь, 1989. – 328 с.

15. Сельское хозяйство Беларуси в 1980–2007 гг.: тенденции развития / сост. В. С. Сакович; под науч. ред. В. Г. Гусакова. – Минск, 2008. – 334 с.

16. Аналитические записки Госкомстата Республики Беларусь по статистике отраслей народного хозяйства // НАРБ. – Ф. 30. – Воп. 13. – Спр. 1917.

17. *Горбачев, М. С.* О практической работе по реанимации решений XIX Всесоюзной партийной конференции Доклад на пленуме ЦК КПСС от 29 июня 1988 г. / М. С. Горбачев // Коммунист. – 1988. – № 12. – С. 4–27.

18. Протокол заседания Пленума ЦК КПБ от 4 октября 1988 года // НАРБ. – Ф. 4-п. – Воп. 160. – Спр. 762. – Арк. 26.

19. Поручения СМ БССР о рассмотрении проектов постановлений СССР и БССР о совершенствовании экономического механизма хозяйствования в агропромышленном комплексе // НАРБ. – Ф. 31. – Воп. 15. – Спр. 848. – Арк. 36.

20. Матэрыялы пленума ЦК КПСС, 15–16 сак. 1989 г. – Мінск: Беларусь, 1989. – 64 с.

21. Мероприятия Госагропрома БССР по переводу колхозов и совхозов республики на самоокупаемость и самофинансирование // НАРБ. – Ф. 7. – Воп. 10. – Спр. 444.

22. Поручения СМ БССР о развитии агропромышленного комплекса и документы к ним // НАРБ. – Ф. 31. – Воп. 15. – Спр. 1788.

23. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Госагропрома БССР за 1989 год // НАРБ. – Ф. 7. – Воп. 10. – Спр. 1374.

24. Докладная записка «О динамике цен на потребляемые сельским хозяйством БССР средства производства и реализуемую колхозами и совхозами республики сельхозпродукцию (паритет цен) за 1982–1988 гг.» // НАРБ. – Ф. 7. – Воп. 10. – Спр. 2182.

25. Протокол № 1 заседания Комиссии ЦК КПБ по аграрным вопросам от 6 мая 1989 г. // НАРБ. – Ф. 4-п. – Воп. 156. – Спр. 658.
26. Матэрыялы XXXI з'езда Камуністычнай партыі Беларусі, 28 лістапада – 1 снежня 1990 года. – Мінск: Выд-ва ЦК КПБ, 1991. – 554 с.
27. Аналитические записки Госкомстата БССР, направленные Госплану БССР // НАРБ. – Ф. 30. – Воп. 13. – Спр. 1619.
28. Ведамасці Вярхоўнага Савета БССР. – 1991. – № 2.
29. Ведамасці Вярхоўнага Савета БССР. – 1991. – № 19.

*M. U. SMIAKHOVICH*

**«NEW AGRARIAN POLICY» IN THE USSR AND ITS SPECIFIC FEATURES IN THE BSSR: MAIN DIRECTIONS (1986–1991 YEARS)**

## Summary

Study of the history of perestroika – one of the topical problems of the Belarusian historiography. Belarusian historians have not still accumulated scientific papers in the format of theses or monographs on the history of perestroika (the restructuring), including the history and development of agricultural production.

Policy of acceleration of the USSR social and economic development, which was adopted in 1986, was declarative and optimistic. Gorbachev's leadership did not provide any other scenarios and possible directions of country development. This short-sighted, erroneous position of the party and political leadership would later play a crucial role in the fate of the Soviet state. In the late 1988 it was revealed that the rate of acceleration of social and economic development hadn't only brought positive results, but also lead the country to a crisis, Gorbachev's leadership hadn't provided any alternative action programs.

The same situation was typical for agriculture. The transition process of changing agriculture to the new economic mechanism, the organization of production, based on the principles of self-government and self-financing, was contradictory. There wasn't any experience of proceedings based on the rental organization of labor in farms. There was not appropriate legal framework. It leaded to a different kinds of abuse. Part of the administrative and managerial staff wasn't interested in the implementation of cost accounting and rent. Pricing policy of the state didn't motivate the development of agricultural production. Increased profitability of agriculture in BSSR in 1990 was the result of increased procurement prices for agricultural products. However, despite the difficulties arising from consequences of the Chernobyl disaster, agriculture in the Soviet Belarus had been developing slowly. Entry into the crisis zone began in the second half of 1990.

Collective and state farms were mainly the resource base of organization and development of the cooperative movement. Activities of producers' cooperatives, which were created in agriculture, were built on the principles of the lease. Motivation of cooperation, built on the financial «maintenance» of cooperatives by collective and state farms, was one of the areas of Gorbachev's policy to eliminate the latter. The source of the social contradictions development were such cooperatives in the villages, farmers were displeased by agricultural policy of the ruling party.

In Belarus, the peasant (farmer's) farms couldn't become a real alternative to the collective farms and state farms. They had to go a long way of evolution and adaptation to modern production. The country had not prospects and policies for rapid redistribution of farm property and the destruction of collective and state farms.

In 1990, the party and state leadership of the BSSR refused to pursue a policy of Gorbachev's perestroika. Later there was developed its own program of social and economic transformation, based on the idea of a gradual transition to a socially oriented market economy. After that, the party and state institutions of the Soviet Belorussia actually went into opposition to Mikhail Gorbachev's leadership. It was a principled position of the Belarusian party and state elite.